**Білет 25**

**Практычнае заданне.**

**Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, асноўныя заняткі, племянныя княствы, кіраванне імі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце саюзы ўсходнеславянскіх плямёнаў, якія склаліся ў VIII-IX стст. на тэрыторыі Беларусі.
2. Ахарактарызуйце геаграфічнае становішча саюзаў славянскіх плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў VIII-IX стст.
3. Якія высновы пра гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян можна зрабіць са звестак персідскага гісторыка Гардзізі?
4. Ахарактарызуйце сістэму кіравання племянным княствам ва ўсходніх славян.

**І. Картасхема. Усходнеславянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі ў VIII-IX стст.**



**II. Звесткі пра славян з твора персідскага гісторыка Гардзізі.**

Краіна славян роўная і лясістая, і яны ў ёй жывуць. Гэта вялікая краіна, і ў ёй вельмі шмат дрэў, якія растуць блізка адзін ад аднаго. У іх няма іншых пасеваў акрамя проса, і няма вінаграду, але вельмі шмат мёду... Яны маюць статкі свіней... Яны носяць высокія боты і кашулі да шчыкалатак. Адзенне іх у большай частцы з ільну ... Рабочай жывелы ў іх зусім няшмат, а коней няма ні ў кога, акрамя цара... зімой яны жывуць у хацінах або зямлянках... Калі памірае ў іх хто-небудзь, труп яго спальваюць.... На другі дзень пасля спалення нябожчыка яны ідуць на месца, дзе гэта адбывалася, збіраюць попел з таго месца і кладуць яго на пагорак... І ўсе яны пакланяюцца агню і шануюць быка…

**III. Схема. Арганізацыя ўсходнеславянскага грамадства.**

